**А.В. Солахаў**
(Мазыр, Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна)
**А.І. Шышова**
(Станькаўская базавая агульнаадукацыйная школа)

# МЕТОДЫКА СТВАРЭННЯ МАЛОДШЫМІ ШКОЛЬНІКАМІ АБРАМЛЕННЯ ДЫЯЛОГУ

Адным з відаў творчай працы малодшых школьнікаў, які выклікае ў іх павышаны інтарэс, з'яўляецца стварэнне сачынення-мініяцюры – абрамлення дыялогу. Вучні, якія звычайна неахвотна бяруцца за сачыненне, тут праяўляюць пэўную актыўнасць. Прычына гэтай метамарфозы заключаецца ў тым, што дзеці адчуваюць сябе ўпэўнена: у іх ёсць аснова сачынення – дыялог, які складаецца з дзвюх або больш рэплік – звычайна гэта якая-небудзь смяшынка або жарт. Такія дыялогі вучням падабаюцца – і ў іх узнікае жаданне зрабіць прыгожае абрамленне. Яно і надае сачыненню асабісты характар.

Абрамленне дыялогу – від сачынення-мініяцюры, у аснове якога знаходзіцца гатовы дыялог, перадаючы які, вучні адлюстроўваюць свае думкі, меркаванні ў выглядзе інфармацыі пра яго ўдзельнікаў, месца, час, умовы іх размовы.

Разгледзім методыку працы па напісанні такога сачынення.

Перш чым абвясціць тэму працы, настаўнік паказвае два аднолькавыя партрэты: адзін – у рамцы, другі – без яе, і звяртаецца да вучняў з пытаннямі:

– Які з гэтых партрэтаў глядзіцца лепш?

– Той, што ў рамцы, – адказваюць дзеці.

– Дыялог, – гаворыць настаўнік, – таксама ўспрымаецца лепш, калі мае слоўнае абрамленне, г. зн. інфармацыю пра тое, хто ўдзельнічае ў размове, дзе, калі і пры якіх абставінах яна адбываецца, як рэагуюць на кожную рэпліку ўдзельнікі дыялогу. Давайце параўнаем два дыялогі – без абрамлення і з абрамленнем.

а) – Давай зарэжам яе: будзе чым гасцей пачаставаць.

– Не, хай лепш гадуецца.

б) Пайшоў бядняк на рэчку па ваду. Аж бачыць – ляжыць у кустах цялушачка. Ды такая слабая, што сама і не ўстане.

Прынёс ён цялушачку дахаты і кажа сваёй жонцы:

– Давай зарэжам яе: будзе чым гасцей пачаставаць.

Спадабалася жонцы цялушачка – такая рыжанькая ды лысенькая.

– Не, – адказвае яна, – хай лепш гадуецца [1, с. 193].

– Які тэкст вам больш падабаецца. Чаму? (Дзеці адказваюць.)

Каб даць вучням заданне – прыдумаць абрамленне дыялогу, настаўнік павінен памятаць аб тым, што аб'ём дыялогу залежыць ад узроставых асаблівасцей школьнікаў і ступені іх чытацкай і маўленчай падрыхтоўкі. У 2-м класе рэкамендуецца выкарыстоўваць 2–4 рэплікі, у 3-м – 4–6, у 4-м – 6–8 [3, с. 28]. Але часцей за ўсё трэба выкарыстоўваць найменшую колькасць рэплік, каб эканоміць час для працы вучняў на ўроку. Калі дзеці навучацца абрамляць дыялогі, смяшынкі, урыўкі з драматычных і празаічных твораў, яны змогуць пашырыць свой слоўнікавы запас ведаў, развіць маўленне і мысленне.

Вучням 4 класа для стварэння абрамлення мы прапанавалі наступную смяшынку:

*– Андрэйка, будзь асцярожны з малатком, а то замест цвіка па пальцы стукнеш.*

*– Не хвалюйся, мама: цвік трымае Пятрок* [4].

Яе чытае спачатку настаўнік, а затым – вучні. Пасля знаёмства са зместам смяшынкі настаўнік праводзіць з вучнямі гутарку па наступных пытаннях:

– Ці здагадаліся вы, хто ўдзельнічаў у размове?

– Як вы даведаліся, што размаўлялі сын і маці?

– Як звалі сына?

– Чым ён займаўся?

– Хто яму дапамагаў?

– Што магла сказаць маці на словы сына: «Не хвалюйся, мама: цвік трымае Пятрок»?

– Чым скончылася размова?

– Што зрабілі Андрэйка і Пятрок?

МГПУ им. И.П.Шамякина

Прыводзім узоры вучнёўскіх сачыненняў-абрамленняў.

*1. Андрэйка і Пятрок вырашылі змайстраваць кармушку для птушак. Яны ўзялі малаток, дошкі, цвікі і прыняліся за працу.*

*– Андрэйка, будзь асцярожны з малатком, а то замест цвіка па пальцы стукнеш, –* сказала маці.

*– Не хвалюйся, мама: цвік трымае Пятрок.*

*— А хіба Петраку не будзе балець?*

*– Я пажартаваў, – адказаў Андрэйка.*

*І яны зрабілі кармушку, павесілі яе на галіну дрэва. Да кармушкі прыляцелі птушкі* (Яўгенія Р.).

*2. Андрэйка і Пятрок майстравалі шпакоўню. Маці паглядзела на іх працу і сказала:*

*– Андрэйка, будзь асцярожны з малатком, а то замест цвіка па пальцы стукнеш.*

*– Не хвалюйся, мама: цвік трымае Пятрок.*

*– Глядзі на малаток, а то будзеш няўважлівым, дасі па пальцах Петраку.*

*– Добра, мама, не хвалюйся. Дзякуй за параду!* (Алеся К.)

Важным этапам у працы па стварэнні абрамлення дыялогу з'яўляецца падвядзенне вынікаў. Трэба, каб вучні прачыталі свае абрамленні, а настаўніку неабходна адзначыць усіх вучняў.

Пакажам методыку працы і яе вынікі з яшчэ адной смяшынкай:

*– Дзед, чуеш?*

*– Не. А што?*

*– Наш кот заснуў, а матор выключыць забыўся* [2].

Прачытаўшы яе сам, а потым з вучнямі, настаўнік задае ім наступныя пытанні:

– Як вы думаеце, хто ўдзельнічаў у размове?

– Як вы здагадаліся, што размаўлялі дзед і ўнучка?

– Назавіце таго, хто запытаўся: «Дзед, чуеш?»

– Назавіце таго, хто адказаў на гэта пытанне словамі: «Не. А што?»

– Назавіце таго, хто абвясціў: «Наш кот заснуў, а матор выключыць забыўся».

– Дзе магла адбыцца такая размова з унучкай?

– Які гэта быў час: раніца, дзень, вечар ці ноч?

– Што рабіў дзед?

– Чым займалася ўнучка?

– Чым магла скончыцца такая размова?

Прыводзім некаторыя сачыненні-абрамленні чацвёртакласнікаў.

*1. Прыгожай раніцай прыехала ўнучка да дзеда ў вёску. Унучку звалі Кацярынай, а дзеда – Косцем. Вось унучка і кажа дзеду:*

*– Дзед, чуеш?*

*– Не. А што?*

*– Наш кот заснуў, а матор выключыць забыўся.*

*Дзед ажно ахнуў:*

*– Як такое можа быць?*

*А Кацярына ззяла ад радасці: ёй удалося здзівіць дзеда.* (Паліна С.)

*2. Унучка Алеся спыталася ў дзеда Патапа:*

*– Дзед, чуеш?*

*– Не. А што?*

*– Наш кот заснуў, а матор выключыць забыўся.*

*– А ў нас хіба ёсць кот?* (Марыя А.)

*3. Дзед з унучкай клаліся спаць, узялі з сабой ката. Амаль заснулі, але пачулі, як хтосьці мурлыкае. Унучка пытае ў дзеда:*

*– Дзед, чуеш?*

*– Не. А што?*

*– Наш кот заснуў, а матор выключыць забыўся.*

*– Гэта ён убачыў салодкія сны. Спі і ты. І ў цябе яны будуць добрыя.* (Дзіяна Г.)

*4. Маленькая ўнучка Іра запыталася ў дзеда Васі:*

*– Дзед, чуеш?*

*– Не. А што?*

МГПУ им. И.П.Шамякина

*– Наш кот заснуў, а матор выключыць забыўся.*
*– Які жах… Ён жа кот, а не чалавек! Як ён зможа выключыць матор?*
*– Дзед, як-як, звычайна, так, як і ўключыў.* (Валерыя А.)

Калі пры напісанні абрамлення малодшы школьнік выкарыстоўвае 4 і больш сказаў, то гэта добры паказчык, калі менш, то можна меркаваць пра не вельмі добрую ступень развіцця яго маўленчай падрыхтоўкі. Праца з такім сачыненнем дазваляе выявіць узровень мысліцельнай дзейнасці вучняў, іх слоўнікавага запасу, арфаграфічнай падрыхтаванасці. Яна спрыяе рэалізацыі ўласнага маўленчага вопыту дзяцей і набыццю неабходных уменняў у галіне маўленчай дзейнасці. Праведзеная намі эксперыментальная праца ў школе пацвярджае трываласць і запатрабаванасць тых уменняў, якія фарміруюцца пры творчай працы вучняў з дыялогам і ўплываюць на ўзровень развіцця маўленчай дзейнасці малодшых школьнікаў.

**Літаратура**

1. Разумная дачка: беларуская народная казка // Яленскі, М.Г. Крынічка: вучэб. дапам. па беларус. мове для 1-га кл. шк. з рус. мовай навучання / М.Г. Яленскі, Т.М. Гракові́ч. – 2-е выд. Мінск: Нар. Асвета, 1992. – С. 192–196.

2. Смяшынка // Акрайчык: чытанка для 1–2-х кл. / уклад. Г. Каржанеўская, М. Яфімава. – Мінск: Нар. асвета, 1995. – С. 39.

3. Солахаў, А. В. Дыялог як сродак развіцця маўлення малодшых школьнікаў на ўроках роднай мовы / А. В. Солахаў // Беларуская пачатковая школа: праблемы і перспектывы развіцця: матэрыялы VI Міжнар. навук.-практ. канф., 17–18 кастр. 2007 г. – Мазыр, 2007. – С. 27–28.

4. Стадольнік, І. Не хвалюйся, мама / Іван Стадольнік // Вясёлка. – 2009. – № 8. – С. 23.

МГПУ им. И.П.Шамякина